УДК 94(47+57)"1941/45"+930(476)

# МІЖНАЦЫЯНАЛЬНЫЯ АДНОСІНЫ НА АКУПІРАВАНАЙ НАЦЫСТАМІ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў АДЛЮСТРАВАННІ АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

***У.В. Здановіч***

*Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна, 224016, Рэспубліка Беларусь, г. Брэст, бульвар Касманаўтаў 21, e-mail: zvv2003@tut.by*

У артыкуле аналізуюцца працы беларускіх даследчыкаў, прысвечаныя міжнацыянальным адносінам на акупаванай нацыстамі тэрыторыі Беларусі. Гістарыяграфічны агляд сведчыць, што шэраг пытанняў вылучанай тэмы атрымалі асвятленне ў айчыннай гістарыяграфіі. Асаблівае значэнне надавалася беларуска-польскім і украінска-беларускім адносінам на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Гісторыя іншых нацыянальных меншасцяў у літаратуры згадваецца пераважна ў кантэксце больш значных праблем. Адначаецца, што ў розных акупацыйных структурных адзінках нацыянальная палітыка германскіх уладаў мела свае асаблівасці і была накіравана на размежаванне нацыянальных супольнасцяў. Абвастрэнню нацыянальных адносін на акупаванай тэрыторыі Беларусі садзейнічалі жорсткая рэпрэсіўная палітыка СССР, асабліва ў адносінах да насельніцтва Заходняй Беларусі, напярэдадні вайны, шырокая прапаганда і агітацыя акупантаў, дзейнасць польскіх і ўкраінскіх нацыяналістычных фарміраванняў.

***Ключавыя словы:*** *гістарыяграфія; Вялікая Айчынная вайна; Заходняя Беларусь; нацысцкая акупацыйная палітыка; міжнацыянальныя адносіны.*

# МЕЖНАЦИОНАЛЬНЫЕ ОТНОШЕНИЯ НА ОККУПИРОВАННОЙ НАЦИСТАМИ ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ В ОТРАЖЕНИИ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ИСТОРИОГРАФИИ

***В. В. Зданович***

*Брестский государственный университет имени А. С. Пушкина, 224016, Республика Беларусь, г. Брест, бульвар Космонавтов 21, e-mail: zvv2003@tut.by*

В статье анализируются работы белорусских исследователей, посвященные межнациональным отношениям на оккупированной нацистами территории Беларуси. Историографический обзор свидетельствует, что ряд вопросов выбранной темы получили освещение в отечественной историографии. Особое значение придавалось белорусско-польским и

украинско-белорусским отношениям на территории Западной Беларуси. История других национальных меньшинств в литературе упоминается преимущественно в контексте более значимых проблем. Отмечается, что в различных оккупационных структурных единицах национальная политика германских властей имела свои особенности и была направлена на разграничение национальных сообществ. Обострению национальных отношений на оккупированной территории Беларуси содействовали жесткая репрессивная политика СССР, особенно по отношению к населению Западной Беларуси, накануне войны, широкая пропаганда и агитация оккупантов, деятельность польских и украинских националистических формирований.

***Ключевые слова:*** *историография; Великая Отечественная война; Западная Беларусь; нацистская оккупационная политика; межнациональные отношения.*

## INTERETHNIC RELATIONS IN THE BELARUSIAN NAZI OCCUPIED TERRITORY IN BELARUS

***V.V. Zdanovich***

*Brest State University named after A.S. Pushkina, 224016, Republic of Belarus, Brest, Cosmonauts Boulevard 21, e-mail: zvv2003@tut.by*

The article analyzes the work of Belarusian researchers devoted to ethnic relations in the Nazi-occupied territory of Belarus. Historiographic review shows that a number of issues of the selected topic have been covered in domestic historiography. Particular importance was attached to the Belarusian-Polish and Ukrainian-Belarusian relations in the territory of Western Belarus. The history of other national minorities is mentioned in the literature mainly in the context of more significant issues. It is noted, however, that in the various occupying structural units, the national policy of the German authorities had its own peculiarities and was aimed at dividing national communities. The aggravation of national relations in the occupied territory of Belarus was facilitated by the brutal repressive policies of the USSR, especially with regard to the population of Western Belarus, on the eve of the war, the widespread propaganda and agitation of the invaders, and the activities of Polish and Ukrainian nationalist groups.

***Key words:*** *historiography; Great Patriotic War; Western Belarus; nazi occupation policy; interethnic relations.*

Нягледзячы на тое, што вывучэнне гісторыі нацысцкага акупацыйнага рэжыму ў гады Вялікай Айчыннай вайны застаецца адным

з прыярытэтных напрамкаў айчыннай гістарычнай навукі, многія праблемы айчыннай ваеннай гісторыі застаюцца недастаткова вывучанымі. Да іх ліку адносіцца і праблема ўзаемастасункаў прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей, пражываючых на акупіраванай тэрыторыі рэспублікі. У савецкі перыяд асаблівасці нацыянальнай палітыкі захопнікаў асвятліліся лаканічна і не давалі поўнага ўяўлення пра складаныя этнічныя працэсы. Характэрнай асаблівасцю беларускага перыяду стала засваенне новых накірункаў у даследаванні праблемы, а таксама дэталёвае асвятленне разнастайных аспектаў акупацыйнага рэжыму, разгляд якіх у савецкай гістарыяграфіі вызначаўся лаканічнасцю. Не абышлі ўвагай даследчыкі і праблему міжнацыянальных адносін на акупіраваных нацыстамі тэрыторыях, што ў значнай ступені звязана са спробамі нацыянальных гісторыкаў нанова асэнсаваць гісторыю, вызначыць у ёй сваё месца.

Міжнацыянальныя адносіны знайшлі адлюстраванне ў разнастайных гістарыяграфічных крыніцах : фундаментальных абагульняльных працах па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, гісторыі Беларусі, гісторыі партызанскага руху і падпольнай барацьбы; манаграфіях; артыкулах ў перыядычным друку і зборніках. Да абагульняльных і калектыўных прац, у якіх утрымліваецца значны фактычны матэрыял, адносяцца “Беларусь в годы Великой Отечественной войны” [1], “Беларусь. 1941–1945: Подвиг. Трагедия. Память” [2], “Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.” [3], “Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг” [4], “Разняволеная памяць. Прымусовая праца беларускіх грамадзян на акупіраванай тэрыторыі Беларусі (1941–1944 гг.) [5] і “Вяртанне ў рабства: прымусовая праца насельніцтва Беларусі. 1941–1945 гг.” [6], 6-томная “Гісторыі Беларусі” [7], “История белорусской государственности” [8].

Асобныя аспекты вылучанай тэмы разглядаюцца ў манаграфіях В.В. Барабаша [9], А.А. Кавалені [10], А.М. Літвіна [11], М.Г. Жылінскага [12], Я.А. Грэбеня [13], В.І. Ермаловіча і С.В. Жумара [14], Д.А. Крывашэя [15], Э.С. Ярмусіка [16], артыкулах У.І. Гуленкі [17].

Праведзены гістарыяграфічны аналіз дазваляе сцвярджаць, што нацыянальная палітыка акупантаў у значнай ступені залежала ад падзей на франтах вайны і спалучала ў сабе імкненне да падштурхоўвання міжнацыянальных канфліктаў і тактыку палітычнай ізаляцыі,

недапушчэнне самастойнага нацыянальнага ўплыву на акупіраваных тэрыторыях. Найбольш яскрава асаблівасці нацыянальнай палітыкі акупантаў праявіліся ў заходнебеларускім рэгіёнё, які па сваім палітычным, сацыяльна-эканамічным, канфесійным і нацыянальным становішчы істотна адрозніваўся ад астатняй тэрыторыі БССР.

Асобае месца ў рэгіёне займалі беларуска-польскія адносіны, абвастрэнню якіх садзейнічалі зменлівыя паводзіны акупацыйных улад, якія эвалюцыяніравалі ад падтрымкі прадстаўнікоў польскай нацыянальнасці да курса В. Кубе, накіраванага на падтрымку беларусаў. Нацыянальныя супярэчнасці праявіліся і пад час пастаўкі рабочай сілы ў Германію. “У залежнасці ад таго, кім былі прадстаўнікі мясцовай адміністрацыі, – падкрэсліваюць аўтары манаграфіі “Вяртанне ў рабства”, – на прымусовую працу адпраўляліся прадстаўнікі варожага этнасу” [6, с. 261].

На этнічныя працэсы ўплывала і канфесійная сітуацыя ў рэгіёне, якая мела глыбокія гістарычныя карані. “Словазлучэнні “паляк-католік” і “беларус-праваслаўны”, – адзначае Э.С. Ярмусік –ўспрымаліся не толькі як знакі пэўнай эпохі, але і як ідэйныя сімвалы ў жорсткай палітычнай барацьбе за цалкам вызначаныя тэрыторыі Заходняй Беларусі” [16, с. 164–165].

Яшчэ больш канфліктны характар беларуска-польскія адносіны набылі на тэрыторыі заходніх рэгіёнаў Гродзеншчыны, якія былі далучаны да асобай акругі “Беласток” і ўключаны ў склад Усходняй Прусіі. У адпаведнасці з планамі нямецкай адміністрацыі тэрыторыю планавалася “анямечыць” і інкарпараваць у Трэці Рэйх, таму што яна, на думку кіраўніцтва Германіі, не з’яўлялася ні польскай, ні беларускай, але выключна германскай. Рэалізацыі дадзенага плана садзейнічала і ўвядзенне на тэрыторыі Гродзеншчыны дзвух афіцыйных моў – нямецкай і беларускай. Разам з тым, першапачаткова аналагічны статус захоўвала і польская мова. Як адзначае Я.Ф. Калубовіч, адзін з дзеячаў Беларускай Цэнтральнай Рады, калабарацыянісцкай адміністрацыі, створанай нямецкімі акупацыйнымі ўладамі ў прапагандысцкіх мэтах, нямецкае камандаванне скарысталася палякамі, якія, ведаючы мясцовыя ўмовы і адміністрацыйны апарат прапанавалі акупантам свае паслугі [18, с. 15, с. 21]. Вынікам дадзенай палітыкі ў першыя ж дні сталі шматлікія даносы

і расправы з прадстаўнікамі беларускай інтэлігенцыі і свядомым вясковым актывам.

Супрацьстаянне паміж прадстаўнікамі польскай і беларускай нацыянальнасцей узмацняла дзейнасць на тэрыторыі Беларусі Арміі Краёвай. Прэтэнзіі лонданскага польскага ўрада,на землі Заходняй Беларусі прыводзілі да непазбежнага канфлікту паміж акаўцамі і савецкімі партызанамі. “Вынік барацьбы, – падкрэсліваюць аўтары калектыўнага выдання “Беларусь в годы Великой Отечественной войны”, – быў трагічным для абодвух бакоў, кожны з якіх адстойваў сваю праўду і не шкадаваў для гэтага сіл і сродкаў” [1, с. 292].

Аднак, нягледзячы на азначаныя акалічнасці, супрацьстаянне паміж прадстаўнікамі польскай і беларускай нацыянальнасцей не набыло такога крывавага канфлікту, як паміж палякамі і украінцамі, які дасягнуў свайго піку 11 ліпеня 1943 г., калі адначасова было атакавана больш за 150 польскіх населеных пунктаў на тэрыторыі Валыні.

Як адзначае беларускі даследчык В.В. Барабаш “гуляючы на існаваўшых міжнацыянальных супярэчнасцях, гітлераўцам удалося справакаваць канфлікты паміж украінцамі і палякамі ў асобных раёнах Беларусі, далучаных да рэйхскамісарыята “Украіна” і паміж літоўцамі і палякамі ў паўночназаходніх раёнах Беларусі, якія адышлі да генеральнай акругі “Літва”. Разам з тым былі асуджаныя на няўдачу актыўныя спробы фашыстаў  распаліць буйнамаштабную вайну паміж палякамі і беларусамі Польскае насельніцтва Беларусі на працягу ваенных гадоў усё больш актыўна ўключалася ў барацьбу з акупантамі ў шэрагах савецкіх антыфашыстаў” [19, с. 14].

Свае асаблівасці мела нацыянальная палітыка акупантаў на большай частцы Брэсцкай, Пінскай і часткова Палескай абласцей Беларусі, якія згодна з новым адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам  увайшлі ў склад райхскамісарыята “Украіна”. Так, у Брэсце ў адрозненне ад Генеральнай акругі Беларусь, на тэрыторыі якой В. Кубе з восені 1941 г. зрабіў стаўку на падтрымку беларусаў, праводзілася палітыка, накіраваная на ўкраінізацыю горада. Дзяржаўнымі мовамі ў горадзе былі аб’яўлены нямецкая і ўкраінская. Аднак, украінская мова аказалася не зразумелай для большасці жыхароў і ўжо 6 лістапада 1941 г. было выдадзена распараджэнне Брэсцкага гарадскога камісара ў адпаведнасці з якім дапускалася выкарыстанне польскай мовы [22, с. 24].

Праводзячы ідэалагічную апрацоўку украінцаў, гітлераўцы сцвярджалі, што галоўныя ворагі ўкраінцаў – гэта “маскалі”, што ўкраінцы вышэй рускіх, так як яны нібыта перажылі жыватворны ўплыў арыйскай расы ў сярэднія вякі. Для ваеннапалонных украінцаў ўсталёўваўся больш мяккі рэжым, а частка іх была ў пачатку вайны вызвалена з палону і адпушчана дахаты. Беларусам гітлераўская прапаганда імкнулася даказаць, што іх ворагі рускія, якія эксплуатавалі беларусаў, а таксама палякі і яўэі. Таму шчаслівая будучыня Беларусі, згодна з гітлераўскай прапагандай, магла быць толькі пад абаронай Германіі і пры ўмове ўдзелу беларусаў у барацьбе супраць савецкага партызанскага руху.

Такая палітыка актывізавала дзейнасць у паўднёвых раёнах рэспублікі ўкраінскіх нацыяналістаў і перш за ўсё арганізацый АУН–УПА. У 1990-я гг. ва Украіне пачаў актыўна культывавацца вобраз удзельнікаў нацыяналістычнага падполля як актыўных змагароў супраць савецкага таталітарызму. У беларускіх даследчыкаў іншы погляд на праблему. Стрыжнем сучаснай беларускай гістарыяграфіі з’яўляецца цалкам апраўданая выснова аб тым, што пазіцыя ўкраінскіх нацыяналістаў залежала ад ваенна-палітычных абставінаў, якія складваліся на фронце і ў тыле германскіх войск. Да лета 1943 г. аўнаўцы актыўных баявых дзеянняў супраць савецкіх партызан не вялі, а ў адносінах да акупацыйных войск займалі пазіцыю пасіўнай абароны. Пасля 1943 г. украінскія нацыяналістычныя фарміраванні перайшлі да барацьбы з савецкімі партызанскімі атрадамі і брыгадамі. Дадзеная выснова, у прыватнасці, утрымліваецца ў артыкулах У.І. Гуленкі [18].

Абвастрэнню нацыянальных адносін на акупаванай тэрыторыі Беларусі садзейнічалі таксама жорсткая рэпрэсіўная палітыка СССР, асабліва ў адносінах да насельніцтва Заходняй Беларусі, напярэдадні вайны, паражэнні Чырвонай Арміі ў пачатковы перыяд ваенных дзеянняў, шырокая прапаганда і агітацыя акупантаў. У цэлым жа перыяд вайны адзначаны надзвычай глыбокай змяненнем каштоўнаснай сістэмы каардынатаў, у якой жыло беларускае грамадства. Смерць і разбурэнні ў выніку баявых дзеянняў, страта блізкіх і родных, здзекі захопнікаў выклікалі цяжкую псіхалагічную траўму мільёнаў людзей, якія не былі гатовыя да такой працяглай і знясільваючай вайны, голаду, холаду, генацыду.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Беларусь в годы Великой Отечественной войны : 1941–1945 гг. / А. А. Коваленя (рук. авт. кол.) [и др.]. Минск : БелТА, 2005.

2. Беларусь. 1941–1945: Подвиг. Трагедия. Память : в 2 кн. / НАН Беларуси, Ин-т истории ; редкол.: А. А. Коваленя (пред.) [и др.]. Минск : Беларус. навука, 2010.

3. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў к. XVIII – пач. XXI стст. : у 2 кн. / рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск : Беларус. навука, 2012. Кн. 2 / М. У. Смяховіч [і інш.].

4. Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг. : в 2 кн. / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории / редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. Минск : Беларус. навука, 2014. Кн. 2.

5. Разняволеная памяць. Прымусовая праца беларускіх грамадзян на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941–1944 гг.) : зб. навук. арт. / пад рэд. А. М. Літвіна. Мінск : Медысонт, 2010.

6. *Літвін А. М.* Вяртанне ў рабства: прымусовая праца насельніцтва Беларусі (1941–1945 гг.): пер. / А. М. Літвін, Я. А. Грэбень, С. Я. Новікаў ; агул. рэд. А. М. Літвіна. Мінск : Тэсей, 2010.

7. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : Экаперспектыва, 2000–2006. Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. 2006.

8. История белорусской государственности. В 5 т. Т. 4 Белорусская государственность накануне и в период Великой Отечественной войны и послевоенного восстановления (1939–1953 гг.) / А.А. Коваленя [ и др.]. Минск: Беларуская навука, 2019.

9. *Барабаш В. В.* Поляки в антифашистской борьбе на территории Беларуси (1941–1944 гг.). Гродно : ГрГУ, 1998.

10. *Каваленя А. А.* Прагерманскія саюзы моладзі Беларусі. 1941–1944. Вытокі. Структура. Дзейнасць. Мінск : БДПУ імя М. Танка, 1999.

11. *Літвін А.М.* Акупацыя Беларусі (1941–1944): пытанні супраціву і калабарацыі. Мінск : Беларус. кнігазбор, 2000.

12. *Жылінскі М. Г.* Адукацыя на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (чэрвень 1941 – ліпень 1944 гг.) / Навук. рэд. А.А. Каваленя. Мінск : БДПУ, 2006.

13. *Гребень Е.А.* Гражданское население Беларуси в условиях немецкой оккупации (1941–1944 гг.). Минск : БГАТУ, 2016.

14. *Ермолович В.И.* Огнем и мечом: Хроника польского националистического подполья в Белоруссии (1939–1953 гг.) / В.И. Ермолович, С.В. Жумарь. Минск: БелНИЦДААД, 1994.

15. *Кривошей Д.А.* Судьбы народов Беларуси под оккупацией (июнь 1941 – июль 1944 гг. М. : Фонд «Историческая память», 2017.

16. *Ярмусик Э.С.* Католический костел в Белоруссии в годы Второй мировой войны (1939–1945). Гродно : ГрГУ, 2002.

17. *Гуленка У. І.* Палеская сеч украінскай паўстанцкай арміі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БелЭн, 1993–2003. Т. 5. 1999. С. 385

18. Под немцами. Воспоминания, свидетельства, документы. Историко-документальный сборник / Сост. К.М. Александров. СПб: Скрипториум, 2011.

19. *Барабаш В.В.* Поляки в антифашистской борьбе на территории Беларуси (1941–1944 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / В.В. Барабаш ; Белорус. гос. пед. ун-т. Минск, 1999.

20. Брест в 1941–1944 гг. Оккупация. Документы и материалы / Учрежд. «Государственный архив Брестской области»; сост. Г.Д. Калустова [и др.]. Брест: Альтернатива, 2016.